3. Войтенко В. Народное образование в Белоруссии по статистическим данным за 1921 год // Вестник Народного Комиссариата просвещения С.С.Р.Б. 1922. № 5/6. С. 38–42.
4. Вопрос о народном просвещении на 3-ем Всебелорусском съезде Советов // Вестник Народного Комиссариата просвещения С.С.Р.Б. 1922. № 3. С. 20–21.
5. Канценбоген С. З. Народное просвещение и задачи партии // Вестник Народного Комиссариата ПросвещенияС.С.Р.Б. 1921. № 2. С. 3–10.
6. Национальный архив Республики Беларусь (далее – НАРБ). Ф. 4п. Оп. 1. Д. 492.
7. НАРБ. Ф. 6. Оп. 1. Д. 124.
8. НАРБ. Ф. 6. Оп. 1. Д. 211.
9. НАРБ. Ф. 30. Оп. 1. Д. 3162.
10. НАРБ. Ф. 42. Оп. 1. Д. 94.
11. НАРБ. Ф. 42. Оп. 1. Д. 96.
12. НАРБ. Ф. 42. Оп. 1. Д. 614.
13. Народное образование в БССР : сб. документов и материалов. Т. 1. 1917–1928 гг. / сост. Р.С. Васильева [и др.]. Минск: Нар. асвета, 1979.

**УДК 94(438).081:323/070"1924/1939"**

# ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫЯ І САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫЯ ПРАЦЭСЫ Ў ПОЛЬШЧЫ Ў АДЛЮСТРАВАННІ ЧАСОПІСА “БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА” (1924–1939)

***Л. А. Козік***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Kozik@bsu.by*

Мэтавай аўдыторыя беларускага часопіса “Беларуская работніца і сялянка” былі жанчыны. Фарміраванне іх светапогляду, знаёмства з асноўнымі сацыяльна-эканамічнымі і грамадска-палітычнымі пераўтварэннямі ў БССР/СССР выступала асноўнай задачай выдання. Разам з гэтым, часопіс фарміраваў уяўленні пра сітуацыю ў суседніх, капіталістычных, краінах. Адной з іх была Польская Рэспубліка. У часопісе змяшчалася пераважна інфармацыя пра становішча ў ёй нацыянальных меншасцей, эканамічную і сацыяльную палітыку польскіх уладаў, рабочы рух, пераслед актывістаў і інш. Значная частка публікацый была пабудавана на кантрасце добрай сітуацыі ў БССР/СССР і дрэннай у Польшчы. Вынікам гэтага было стварэнне адмоўнага вобраза Польшчы і палякаў у беларускім грамадстве ў 1924–1939 гг.

***Ключавыя словы:*** *БССР; Польшча; “Беларуская работніца і сялянка”; прапаганда; жаночыя выданні.*

# ОБЩЕСТВЕННО-ПОЛИТИЧЕСКИЕ И СОЦИАЛЬНО-ЭКОНОМИЧЕСКИЕ ПРОЦЕССЫ В ПОЛЬШЕ В ОТРАЖЕНИИ ЖУРНАЛА «БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА» (1924–1939)

***Л. А. Козик***

*Белорусский государствнный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Kozik@bsu.by*

Целевой аудиторией белорусского журнала «Беларуская работніца і сялянка" («Белорусская рабочая и крестьянка») были женщины. Основной задачей издания являлось формирование их мировоззрения, знакомство с основными социально-экономическими и общественно-политическими преобразования в БССР/СССР. Вместе с тем, журнал формировал представления о ситуации в соседних, капиталистических странах. Одной из них была Польская Республика. В издании преобладала информация о положении в ней национальных меньшинств, экономической и социальной политике польских властей, рабочем движении, преследованиях активистов и др. Материал преимущественно был построен на контрасте хорошей ситуации в БССР/СССР и плохой в Польше. Результатом этого было создание негативного образа Польши и поляков в белорусском обществе в 1924–1939 гг.

***Ключевые слова:*** *БССР; Польша; «Беларуская работніца і сялянка» ("Белорусская рабочая и крестьянка»); пропаганда; женские издания.*

# POLITICAL AND SOCIO-ECONOMIC DEVELOPMENT OF POLAND IN THE PRESENTATION OF THE MAGAZINE "BELARUSKAJA RABOTNITSA I SYALYANKA" ["BELARUSIAN WORKER AND PEASANT WOMAN"] (1924–1939)

***L. Kozik***

*Belarusian State University, 4, Niezaležnasci Ave., Minsk 220030, Belarus, Kozik@bsu.by*

Women were the target audience of the Belarusian magazine "Belarusian Worker and Peasant Woman". The main task of the periodical was to form their worldview, to present the main socio-economic and political transformations in the BSSR/USSR. At the same time, the magazine formed the vision of the capitalist countries development. One of them was the Polish Republic. The information about the position of the national minorities, the economic and social policy of the Polish authorities, the labour movement, the persecution of activists was dominating in the magazine. Most of the articles were based on the contrast of the

good situation in the BSSR/ USSR and the bad in Poland. The creation of a negative image of Poland and Poles in Belarusian society in 1924–1939 was a result of such kind of practices.

***Keywords:*** *BSSR; Poland; "Belaruskaja Rabotnitsa i Sialyanka" ("Belarusian Worker and Peasant Woman"); propaganda; women's periodicals.*

Усталяванне савецкай улады ў Беларусі суправаджалася як грамадска-палітычнымі і сацыяльна-эканамічнымі пераменамі, так і фарміраваннем новага светапогляду жыхароў рэспублікі. Адным са сродкаў дасягнення гэтай мэты быў выпуск перыядычных выданняў, арыентаваных на розныя групы насельніцтва. Сярод іх быў і часопіс "Беларуская работніца і сялянка", мэтавай аўдыторыяй якога былі жанчыны. Рашэнне аб яго стварэнні і распаўсюджанні было прынята ЦК КП(б)Б на падставе рашэння XIII з'езда РКП(б) аб умацаванні працы перыядычных выданняў для работніц і сялянак [1, арк. 91].

У БССР выданне часопіса была даручана жаночаму аддзелу ЦК КП(б)Б. Выхад першага нумара быў прымеркаваны да гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі, правядзення ўсебеларускага з'езда грамадскіх дзяячак і стварэння дэлегацкіх сходаў [1, арк. 182; 2, арк. 15, 17]. Адбылося гэта ў лістападзе 1924 г. Перыядычнасць выхаду часопіса вагалася ад 1 да 3 нумароў у месяц. Пад уплывам сацыяльна-эканамічных і палітычных пераўтварэнняў у БССР восенню 1931 г. адбылася змена яго назвы на "Работніца і калгасніца Беларусі"[2]. Часопіс распаўсюджваўся праз падпіску і свабодны продаж, а яго тыраж вагаўся ад 3 да 18,5 тысяч экзэмпляраў [3, с. 12–13].

Асноўны матэрыял разглядаемага выдання датычыўся грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця БССР і СССР. Падзеі ў замежных краінах пераважна разглядаліся з пункту гледжання міжнароднай сітуацыі і барацьбы рабочага класа за свае правы. Што тычыцца публікацый часопіса пра суседнюю Польшчу, то ўмоўна іх можна аб'яднаць у тры тэматычныя блокі: 1) становішча насельніцтва Заходняй Беларусі, 2) становішча рабочых у Польшчы ў цэлым, 3) палітычныя працэсы.

Апісваючы сітуацыю ў Заходняй Беларусі (а часам і Заходняй Украіне), рэдакцыя падкрэслівала факт акупацыі гэтай тэрыторыі.

[2] У 1941–1995 гг. ён выходзіў пад назвай "Работніца і сялянка", а з 1995 г. вядомы як часопіс "Алеся".

Сярод асноўных сацыяльна-эканамічных праблем, якія закраналіся ў публікацыях, можна вылучыць праблему малазямелля, падатковага цяжара і вынікаючых з нявыплаты падаткаў праблем, функцыянаванне сістэмы школьнай адукацыі на беларускай мове і інш.

Ужо ў першым нумары часопіса з’явілася рубрыка “Жыццё і барацьба замежных рабочых і сялян” (яна не была пастаяннай, асабліва ў 1930-я гады). Першая публікацыя ў ёй была прысвечана апісанню становішча ў Польшчы. Артыкул быў напісаны на супрацьпастаўленні сітуацыі ў савецкай Беларусі і “панскай Польшчы”, дзе “земля панская, жизнь подневольная, печальная… чужая школа, чужая панская жизнь” [4, с. 23]. Аўтар падкрэсліваў, што сяляне Заходняй Беларусі жывуць у Польшчы горш, чым пры цары. Аргументамі на карысць такога сцвярджэння выступалі тыя факты, што зямля належыць памешчыкам, сяляне жывуць пераважна ў зямлянках, зямельныя надзелы сялян былі ўрэзаны, частка зямлі была перададзена асаднікам, а ўлады ў гэтых умовах яшчэ “дзяруць скуру” простага чалавека падаткамі. Пастаянным лейтматывам гэтага і іншых артыкулаў выступала падкрэсліванне таго, што “над панам управы няма”, “улада панская, суды панскія”, а ўстаноў, якія я б абаранялі рабочага і ахоўвалі яго правы, няма [4, с. 24]. У артыкулах неаднаразова падкрэслівалася дрэннае стаўленне да жыхароў Заходняй Беларусі як з сацыяльнага пункту гледжання, так і з нацыянальнага. Асабліва выразна гэта прасочваецца ў матэрыялах, дзе гаворка ідзе пра “жудасці і катаванні”, якія ўчыняюць “польскія жандармы, паліцыя і уланы над беларускімі сялянамі” [5, с. 9].

На фоне палітыкі беларусізацыі ў БССР рэдакцыя звяртала ўвагу на становішча беларускіх (зрэдку ўкраінскіх) школ у Польшчы. У артыкулах гаворка шла пра тое, што ў беларусаў і ўкраінцаў няма магчымасці для культурнага развіцця, ім не дазваляюць ствараць школы [6, с. 3–4], дзяцей “гвалтам заганяюць у польскія школы” [7, с. 5], а самі школы носяць польскі характар. Калі польскія ўлады пачалі палітыку па закрыцці беларускіх і ўкраінскіх школ, то аўтары часопіса сталі пісаць пра планамерную паланізацыю беларускіх і ўкраінскіх дзяцей [8, с. 2; 9, с. 4; 10, с. 17].

Яшчэ адной праблемай, якая часта адлюстроўвалася на старонка часопіса “Беларуская работніца і сялянка”/“Работніца і калгасніца Беларусі”, было сацыяльнае і эканамічнае становішча польскіх рабочых/работніц. Асноўная ўвага ў выданні надавалася сітуацыі ў

тэкстыльнай прамысловасці, дзе пераважна працавалі жанчыны. Аўтары пісалі пра павелічэнне працягласці працоўнага дня, ніжэйшыя чым у мужчын заробкі, штрафы за правіннасці, рост колькасці захворванняў, павелічэнне нормаў выпрацоўкі, рост беспрацоўя [11, с. 7–8; 12, с. 8; 13, с. 8]. Апошняе рэдакцыя звязвала з рацыяналізацыяй вытворчасці. У ёй савецкія аўтары бачылі ледзь не самую вялікую прычыну бед, бо, на іх думку, яна адбывалася за кошт пасілення эксплуатацыі рабочага класа [14, с. 14; 15, с. 6; 16, с. 6; 17, с. 2 вокладкі]. Ідэалагічным абгрунтаваннем такой пазіцыі выступалі сцвярджэнні, што ў Польшчы ўлада знаходзіцца ў руках капіталістаў, якія больш клапоцяцца пра павелічэнне свайго багацця, чым пра становішча рабочых. Пры гэтым у часопісе ўзнёсла згадвалася сітуацыя ў БССР/СССР, дзе ўлада знаходзіцца ў руках рабочых, а прадпрыемствы краіны працуюць для паляпшэння дабрабыту ўсяго насельніцтва. Такога роду супрацьпастаўленні фарміравалі выразна негатыўны вобраз польскай рэчаіснасці і выключна станоўчы – савецкай.

Колькасць публікацый, у якіх раскрывалася цяжкае становішча пралетарыяту і сялянства ў Польшчы, вырасла з пачаткам сусветнага эканамічнага крызісу. Спасылаючыся час ад часу на польскія перыядычныя выданні, аўтары пісалі пра павелічэнне працоўнага дня да 12–14 гадзін, зніжэнне заробкаў, закрыццё соцень і нават тысяч фабрык і заводаў, рост колькасці беспрацоўных, эпідэміі, голад, вымушаную прастытуцыю, выпадкі самагубства і забойства дзяцей [9, с. 5; 18, с. 6–7; 19, с. 4–5; 20, с. 3–4; 21, с. 10; 22, с. 12–13; 23, с. 10–11; 24, с. 12; 25, с. 4; 26, с. 3; 27, с. 15]. Пры гэтым усё часцей у публікацыях стала з'яўляцца інфармацыя аб падрыхтоўцы Польшчы да вайны, з якой прама ці ўскосна рабілася выснова: вось куды ідуць дзяржаўныя сродкі замест таго, каб дапамагчы абяздоленым [8, с. 2–3; 28, с. 2 вокладкі; 29, с. 9; 30, с. 4].

Такая ацэнка сацыяльна-эканамічнай сітуацыі ў суседняй краіне час ад часу суправаджалася характарыстыкай палітычных падзей. Так, напрыклад, не застаўся незаўважаным дзяржаўныя пераварот 1926 г., прычым постаць Ю. Пілсудскага была паказана ў артыкуле Н. Шульмана “Што адбываецца ў Польшчы” дваяка. З аднаго боку зазначалася, што перамога пад Варшавай у 1920 г. стварыла яму славу нацыянальнага героя і збаўцы Айчыны, з другога – як толькі ён стаў

непатрэбным польскай буржуазіі, яна “адхіліла яго ад улады”. Шульман пісаў, што дзяржаўны пераварот на чале з Пілсудскім падтрымалі рабочыя і сяляне, але маршал нічога не зрабіў “для аблягчэння становішча народных мас”. Ён паспрабаваў прыдаць перавароту законную форму і адмовіўся ад пасады прэзідэнта Польшчы. Пры гэтым аўтар адзначаў, што Пілсудскі выступае за пашырэнне правоў прэзідэнта, абмежаванне правоў сейма і паводзіць сябе як дыктатар [6, с. 3–4].

Наступнай унутрыпалітычнай падзеяй, якая прыцягнула ўвагу журналістаў, сталі парламенцкія выбары 1930 г. У артыкуле Г. А. “Кляса супроць клясы ў Польшчы” зазначалася, што пілсудчыкі атрымалі большасць у Сейме (248 мандатаў) дзякуючы масавым арыштам, вобыскам, прымусу галасаваць за Пілсудскага (хутчэй за ўсё меўся на ўвазе Беспартыйны бок супрацоўніцтва з урадам, створаны прыхільнікамі маршала. – *Л.К.*), адхіленням “непажаданых” для “фашысцкай дыктатуры” кандыдатаў і інш. [8, с. 7].

Прыведзеныя з’явы сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага жыцця Польшчы станавіліся падмуркам для апісання росту “рэвалюцыйных настрояў” і актыўнасці рабочых і сялян і адпаведна барацьбы ўладаў з імі. Сцвярджэнні аб прыгнечаным стане рабочых і сялян, сваволлі жандармаў і паліцэйскіх праходзілі чырвоным радком праз большасць аналізуемых публікацый. З аднаго боку, аўтары характарызавалі сацыяльна-эканамічныя ўмовы жыцця польскай дзяржавы і грамадства, а з другога – давалі прыклады барацьбы з існуючым у Польшчы ладам. У выданні падрабязна апісваліся рабочыя дэманстрацыі і выступленні сялян, арганізаваныя Камуністычнай партыяй Польшчы [12, с. 8; 31, с. 5; 32, с. 14].

Заўважым яшчэ адну асаблівасць публікацый часопіса, прысвечаных праявам незадаволенасці грамадствам сітуацыяй у Польшчы. Штогод рэдакцыя апісвала арганізацыю на дзяржаўным узроўні і правядзенне ў БССР/СССР свята 1 мая. У публікацыях час ад часу пісалася, што савецкія грамадзяне з размахам і ўрачыстасцю адзначаюць Свята працы, у той час як у Польшчы рабочыя робяць гэта ўпотайкі, баючыся арыштаў, альбо знаходзячыся ў турме [33, с. 5; 34, с. 12; 35, с. 4].

Не засталіся па-за ўвагай рэдакцыі палітычныя судовыя працэсы над Грамадой [36, с. 1.; 37, с. 4; 38, с. 4], пасольскім клубам “Змаганне”

[28, с. 2 вокладкі], Б. Тарашкевічам [41, с. 3], працэс 133 [39, с. 4; 40, с. 4] і інш. [42, с. 3; 43, с. 3]. У 1930-я гады абвінавачаныя ў згаданых працэсах паўсталі перад судом ужо ў БССР. Пасля барацьбы з нацдэмаўшчынай прадстаўнікам беларускага нацыянальнага руху ў Польшчы было пастаўлена ў віну супрацоўніцтва з “фашысцкім рэжымам” [44, с. 2–3].

Вялікая ўвага ў публікацыях часопіса надавалася апісанню абыходжання з арыштаванымі і асуджанымі ў польскіх турмах, метадаў катавання, характарыстыцы ўмоў утрымання зняволеных [[11, с. 7-8; 30, с. 4; 42, с. 3; 45, с. 7-8; 46, с. 2; 47, с. 4; 48, с. 4-5; 49, с. 13; 50, с. 7; 51, с. 2 вокладкі]. Вялікі рэзананс выклікала ўвядзенне ў 1931 г. у Польшчы новага турэмнага рэгламенту, які разглядаўся як адыход ад заваяваных яшчэ ў Расійскай імперыі асобых правоў для палітзняволеных [52, с. 4; 53, с. 5-6; 54, с. 2].

Аналіз часопіса “Беларуская работніца і сялянка”/“Работніца і калгасніца Беларусі” паказвае, што яго матэрыялы былі напісаны зыходзячы з палажэнняў пануючай ў СССР ідэалогіі, што давала адпаведнае адлюстраванне рэчаіснасці і фарміраванне “ідэалагічна правільных” высноў. У выданні часта падаваліся аб’ектыўныя даныя аб сітуацыі ў Польшчы, аднак іх ацэнка была пераважна суб’ектыўнай. Са зместу выразна бачныя механізмы маніпуляцыі свядомасцю чытачак: адмысловы падбор фактаў, правядзенне супастаўлення з сітуацыяй у БССР/СССР (заўсёды на карысць савецкай рэчаіснасці), заклікі да падтрымкі рабочых у Польшчы і капіталістычных краінах. У характарыстыцы часопіса Аддзелам культуры і прапаганды ЦК КП(б)Б адзначалася, што “з нумара ў нумар даюцца малюнкі жыцця работніц і сялянак у капіталістычных краінах. “Работніца і калгасніца Беларусі” дабілася таго, што наладзіла сувязь з працоўнымі жанчынамі і палітзняволенымі жанчынамі Польшчы і Заходняй Беларусі” [55, арк. 77]. Амаль пасля кожнай публікацыі пра цяжкае становішча і жорсткія ўмовы ўтрымання палітзняволеных жанчын у турмах Польшчы падавалася інфармацыя, што працоўныя калектывы БССР бяруць шэфства над зняволенымі той ці іншай турмы [напрыклад: 56, с. 11; 57, с. 8-9; 58, с. 9]. Акрамя гэтага, з нумара ў нумар праходзілі лозунгі кшталту “Братэрскае прывітанне работніцам, батрачкам і працоўным сялянкам Польшчы і Заходняй Беларусі, якія гераічна змагаюцца з фашысцкім уціскам” [59, с. 12].

Характарыстыка міжнароднага становішча і знешняй палітыкі Польшчы таксама не вылучалася станоўчымі рысамі. У публікацыях Польскай Рэспубліцы адводзілася роля служкі заходніх краін, што праяўлялася ў выразах кшталу: “новы найміт – панская Польшча” [60, с. 1–2; 61, с. 11]. Асуджалася пазіцыя Польшчы падчас падпісання дамоўленасцей у Лакарна [12, с. 6–8], падкрэслівалася, што яна рыхтуецца да вайны з СССР [30, с. 4; 62, с. 5], і тым не менш з ёй была падпісана мірная дамова [63, с. 2]. І калі пасля 1934 г. пазіцыя Польшчы па шэрагу міжнародных пытанняў амаль не асвятлялася ў часопісе, то ўжо на пачатку 1938 г. заяўлялася, што Польшча ўваходзіць у “блок падпальшчыкаў вайны” [64, с. 12–13].

Заўважым, што польская праблематыка не вычэрпваецца вышэй згаданымі тэмамі. Часам у публікацыях аб грамадскім развіцці БССР сустракалася параўнанне сітуацыі з арганізацыяй і функцыянаваннем дзіцячых садкоў у Беларусі і Польшчы (на карысць першай), у рамках атэістычнай кампаніі гучалі крытычныя заўвагі ў бок каталіцкіх святароў і Папы Рымскага, змяшчалася інфармацыя пра забойства савецкіх прадстаўнікоў у Польшчы, выказвалася асуджэнне рашэння Арганізацыйнага камітэта не дапусціць дэлегацыю палякаў СССР на Варшаўскі з’езд палякаў замежжа ў ліпені 1929 г. і інш.

Такім чынам, у 1924—1939 гг. на старонках часопіса “Беларуская работніца і сялянка”/“Работніца і калгасніца Беларусі” прыводзіліся даныя па асобных пытаннях грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага развіцця Польшчы. Крытычны аналіз выдання, аднак, дазваляе сцвярджаць, што змешчаныя на яго старонках высновы і ацэнкі фактаў былі перадузятымі і насілі пераважна прапагандысцкі характар. Ва ўмовах індактрынацыі савецкага грамадства і адсутнасці альтэрнатыўных крыніц інфармацыі гэта прыводзіла да фарміравання ў насельніцтва перадвызначаных савецкім кіраўніцтвам поглядаў, якія з цягам часу станавіліся догмай. Адначасова з фарміраваннем новага стылю жыцця, быту і светапогляду ў савецкім грамадстве ствараўся выразны вобраз ворага ў выглядзе як капіталістычнага свету ў цэлым, так і асобных краін і народаў. Той адмоўны вобраз Польшчы і палякаў, які вынікаў з публікацый часопіса “Беларуская работніца і сялянка”/“Работніца і калгасніца Беларусі” у 1924–1939 гг. спрыяў фарміраванню ў беларускім грамадстве негатыўнага стаўлення да суседняй краіны і народу. Дадатковым фактарам у гэтым выступала і

тое, што да 1939 г. у БССР у якасці дня незалежнасці было вызначана вызваленне Мінска ад польскіх войскаў у 1920 г. Такім чынам дзяржаўныя ўрачыстасці 11 ліпеня разам з беларускай мелі і антыпольскую складаючую.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусі (далей – НАРБ). Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 1845.

2. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 1823.

3. Рост тыража журнала за дзесяць год // Работніца і калгасніца Беларусі. 1934. No 21. С. 12–13.

4. Григорьев, Г. Всего только несколько шагов (за пограничными столбами) // Беларуская работніца і сялянка. 1924. No 1. С. 23.

5. Як сяляне Заходняй Беларусі змагаюцца з польскімі панамі // Беларуская работніца і сялянка. 1925. No 4. С. 9.

6. Шульман, Н. Что происходит в Польше // Беларуская работніца і сялянка. 1926. No 6. С. 3–4.

7. Грыгор’еў, Г. Як жывецца сялянцы ў Заходняй Беларусі // Беларуская работніца і сялянка. 1926. No 2(16). С. 5.

8. Г. А. Кляса супроць клясы ў Польшчы // Беларуская работніца і сялянка. 1930. No 33. С. 2–3.

9. С. Ж. Працоўныя масы Заходняй Беларусі ў барацьбе за свой Кастрычнік // Работніца і калгасніца Беларусі. 1932. No 19. С. 4.

10. Майская Л. Становішча дзяцей у фашысцкай Польшчы // Работніца і калгасніца Беларусі. 1935. No 13. С. 17.

11. Зарубежная, Е. Как живется работнице в Польше // Беларуская работніца і сялянка. 1926. No 3(17). С. 7–8.

12. Григорьев, Г. Что делается за границей // Беларуская работніца і сялянка. 1926. No 4(18). С. 6–8.

13. Рабочий Sat-Ano. В царстве Пилсудского (Письмо из Лодзи) // Беларуская работніца і сялянка. 1927. No 1. С. 8.

14. Рационализация женского труда на Лодзинских фабриках (Из писем, полученных из Польши на языке эсперанто) // Беларуская работніца і сялянка. 1927. No 12. С. 14.

15. Удар в спину // Беларуская работніца і сялянка. 1928. No 11. С. 6.

16. Как живут лодзинские ткачи // Беларуская работніца і сялянка. 1928. No 11. С. 6.

17. Райс, Е. Работніцы Польшчы пад ціскам // Беларуская работніца і сялянка. 1930. No 12. С. 2 вокладкі.

18. Л. Г. У авангардзе барацьбітоў супроць фашысцкай дыктатуры // Беларуская работніца і сялянка. 1931. No 19. С. 6–7.

19. Ульрых, Л. Работніца ў барацьбе супроць капіталістычнай эксплёатацыі // Работніца і калгасніца Беларусі. 1932. No 12. С. 4–5.

20. М-ан. Барацьба работніц у Польшчы // Работніца і калгасніца Беларусі. 1932. No 27. С. 3–4.

21. Лісты работніц Польшчы // Работніца і калгасніца Беларусі. 1933. No 7. С. 10.

22. Работніцы і сялянкі Заходняй Беларусі стогнуць пад ціскам польскага фашызму // Работніца і калгасніца Беларусі. 1933. No 15. С. 12–13.

23. С. Ж. Голад у вёсках фашысцкай Польшчы // Работніца і калгасніца Беларусі. 1933. No 30. С. 10–11.

24. Пятроўскі. За што засудзілі бязвінную Ганну Качынскую // Работніца і калгасніца Беларусі. 1933. No 36. С. 12.

25. Пятроўскі. Малюнкі беспрацоўя ў Польшчы // Работніца і калгасніца Беларусі. 1934. No 4. С. 4.

26. Пятроўскі. Жыццё і барацьба сялянак Заходняй Беларусі // Работніца і калгасніца Беларусі. 1934. No 8. С. 3.

27. Мацярынская трагедыя // Работніца і калгасніца Беларусі. 1934. No 11. С. 15.

28. Польскі фашызм ня стрымае рэвалюцыйнага руху працоўных мас Заходняй Беларусі // Беларуская работніца і сялянка. 1931. No 3. С. 2 вокладкі.

29. Альшэўскі, А. Працоўныя жанчыны Заходняй Беларусі ў першых радох за рэвалюцыю // Беларуская работніца і сялянка. 1931. No 11. С. 9.

30. С. Ж. У краіне турмаў і шыбеніц // Работніца і калгасніца Беларусі. 1931. No 36. С. 4.

31. Баярская, З. Барацьба замежных работніц за сусьветны Кастрычнік // Беларуская работніца і сялянка. 1930. No 29/30. С. 5.

32. Баі на вуліцах Лодзі. Ні аднаго выпадку штрэйкбрэхэрства // Работніца і калгасніца Беларусі. 1933. No 18. С. 14.

33. 1 мая в Польше (из воспоминаний узника) // Беларуская работніца і сялянка. 1926. No 4 (18). С. 5.

34. М. Першае мая ў Варшаўскай турме // Работніца і калгасніца Беларусі. 1933. No 21. С. 12.

35. Karolina, G. 1-szy Maja w Warszawie (wspomnienia robotnicy) // Работніца і калгасніца Беларусі. 1935. No 8. С. 4.

36. Меярзон. Пад пятой пана // Беларуская работніца і сялянка. 1928. No 3. С. 1.

37. Грамада засуджана // Беларуская работніца і сялянка. 1928. No 6. С. 4.

38. Што азначае гэты прысуд? (З гутаркі са старшынёй ЦК МОПР у БССР т. Славінскім) // Беларуская работніца і сялянка. 1928. No 6. С. 4.

39. Працэс 133. За што іх будуць судзіць // Беларуская работніца і сялянка. 1928. No 2. С. 4.

40. Фашысцкі ўрад Пілсудзкага хоча разграміць рэвалюцыйны рух у Зах. Беларусі (З адозвы ЦК МОПР'у БССР) // Беларуская работніца і сялянка. 1928. No 2. С. 4.

41. Лютым тэрорам польскі фашызм імкнецца задушыць рэвалюцыйны рух рабочых і працоўнага сялянства // Беларуская работніца і сялянка. 1931. No 14. С. 3.

42. Лютуе белы тэрор у фашысцкай Польшчы // Беларуская работніца і сялянка. 1931. No 24. С. 3.

43. Катаваньні, гвалтаваньні і збіенні арыштаваных у Заходняй Беларусі // Работніца і калгасніца Беларусі. 1934. No 5. С. 3.

44. Зюзькоў, А. На контррэвалюцыйную дзейнасць беларускіх нацыянал-дэмакратаў адкажам арганізацыяй новых калгасаў, стварэньнем новых ударных брыгад работніц і калгасьніц // Беларуская работніца і сялянка. 1931. No 9. С. 2–3.

45. Аргус. Там, где власть панов. 19 месяцев польской каторги // Беларуская работніца і сялянка. 1926. No 2(16). С. 7–8.

46. Ад в тюрьме «Лукишки» // Беларуская работніца і сялянка. 1929. No 5. С. 2.

47. Палітычныя вязьняркі польскай турмы. Пільна сачым і радуемся посьпехам сацыялістычнай будоўлі // Беларуская работніца і сялянка. 1930. No 14. С. 4.

48. В. На ўціск адказваем барацьбой // Беларуская работніца і сялянка. 1930. No 14. С. 4–5.

49. Ліст палітзняволеных жанчын катаржнай турмы Фардон да рабочых і сялян Заходняй Беларусі // Работніца і калгасніца Беларусі. 1933. № 22. С. 13.

50. Н. Ліст з фордонской жаночай турмы (верасень 1933 г.) // Работніца і калгасніца Беларусі. 1934. No 1. С. 7.

51. Пісьмо палітзняволеных жанчын Пінскай турмы // Работніца і калгасніца Беларусі. 1935. No 14. С. 2 вокладкі.

52. З-за вастрожных кратаў. Ліст жанчын-палітвязняў Лукіскай турмы // Беларуская работніца і сялянка. 1931. No 12. С. 4.

53. С. Ж. Турмы белапанскай Польшчы заліваюцца крывёю // Беларуская работніца і сялянка. 1931. No 26. С. 5-6.

54. С. Я. Усеагульная галадоўка палітзьняволеных у польскіх турмах // Работніца і калгасніца Беларусі. 1931. No 28. С. 2.

55. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 5475.

56. У. Б. Дапаможам братом і сёстрам захаду. Даволі зьдзекаў, даволі пакут! // Беларуская работніца і сялянка. 1927. No 3. С. 11.

57. Трыкутнік Фабрыкі. Ліст да работніц-тэкстыльшчыц Заходняй Беларусі // Работніца і калгасніца Беларусі. 1932. No 8. С. 8–9.

58. Ліст да сялянак Польшчы і Заходняй Беларусі ад калгасніц калгасу “Камінтэрн” Рубілкаўскі сельсавет, Койданаўскі раён // Работніца і калгасніца Беларусі. 1932. No 8. С. 9.

59. Беларуская работніца і сялянка. 1930. No 12. С. 12.

60. Шапавалаў, Міх. К гадавіне вызвалення Беларусі ад белапалякаў // Беларуская работніца і сялянка. 1926. No 6. С. 1–2.

61. Кугель, Р. Борьба за мир // Беларуская работніца і сялянка. 1929. № 1. С. 11.

62. Ч. Масавае ўцяканне сялян Польшчы ў СССР // Беларуская работніца і сялянка. 1931. No 26. С. 5.

63. Прадаўжаючыйся крызіс сусветнага капіталізма і знешняе становішча Совецкага Саюза (з даклада тав. Сталіна на XVII з’ездзе ВКП(б)) // Работніца і калгасніца Беларусі. 1934. No 3. С. 2.

64. Бутомаў, С. Фашысцкія агрэсары і пагроза вайны // Работніца і калгасніца Беларусі. 1938. No 3. С. 12–13.

**УДК 94(470+571)”1920”**

## ФАРМІРАВАННЕ КАНЦЭПЦЫІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА ГОРАДА (1920-я – ПАЧ. 1930-х гг.)

***Т.У. Пецюкевіч***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь,* tatstsyana98@mail.ru

У артыкуле раскрываецца сутнасць ідэалагічных арыенціраў, якія задавалі вектар пошуку горадабудаўнічай канцэпцыі сацыялістычнага горада; аналізуюцца ідэі савецкіх архітэктараў у кантэксце распрацоўкі праектаў сацгорада і новага рассялення.

***Ключавыя словы:*** *сацыялістычны горад; горад-сад; урбанізацыя; новае рассяленне.*

## ФОРМИРОВАНИЕ КОНЦЕПЦИИ СОЦИАЛИСТИЧЕСКОГО ГОРОДА (1920-е – НАЧ. 1930-х гг.)

***Т.В. Петюкевич***

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости,4, 220030, г. Минск, Беларусь,* tatstsyana98@mail.ru

В статье раскрывается суть идеологических ориентиров, которые задавали вектор поиска градостроительной концепции социалистического города; анализируются идеи советских архитекторов в контексте разработки проектов соцгорода и нового расселения.

***Ключевые слова:*** *социалистический город; город-сад; урбанизация; новое расселение.*

## FORMATION OF THE CONCEPT OF A SOCIALIST CITY (1920-s – EARLY 1930-s)

***T. Petsiukevich***

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Ave., 4, 220030, Minsk, Belarus,* tatstsyana98@mail.ru

The article reveals the essence of the ideological guidelines that set the search vector for the urban planning concept of the socialist city; analyzes the